# ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ ДЛЯ РЭАЛЬНАСЦІ

## Універсітэт высокіх тэхналогій можа пачаць прыём студэнтаў ужо налета

**Калі будучыня краіны — у лічбавізацыі, то будучыня самой лічбавізацыі — у адпаведнай адукацыі. Да гэтай высновы прыйшлі ўсе ўдзельнікі нарады, якую Прэзідэнт правёў па пытаннях развіцця ІТ-сферы. Гутарка стала працягам тэмы, узнятай падчас наведвання кіраўніком дзяржавы Парка высокіх тэхналогій у красавіку. Тады прагучала пытанне адукацыі, а ўчора Аляксандр Лукашэнка разгледзеў канкрэтныя прапановы і падтрымаў ідэю па стварэнні ўніверсітэта «заўтрашняга дня».**

Нарада, якая доўжылася каля дзвюх з паловай гадзін, насамрэч больш нагадвала размову кампетэнтных і зацікаўленых кіраўнікоў. Падчас гутаркі былі абмеркаваныя дакладныя крокі на шляху да ІТ-краіны. Так, ва ўрадзе ёсць прапановы, як удасканальваць сістэмы кіравання інфарматызацыяй і лічбавымі працэсамі. Але спектр актуальных задач нашмат шырэйшы, адзначыў Прэзідэнт.

«Менавіта таму ў пяцігадовай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця інфарматызацыя вылучана як адзін з прыярытэтаў. Пакуль у гэтым кірунку хваліцца асаблівa няма чым», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы і нагадаў, што на пятым Усебеларускім народным сходзе была пастаўлена задача да 2020 года стварыць паўнавартасны электронны ўрад.

Аляксандр Лукашэнка анансаваў сур'ёзную нараду па ўсіх праблемах лічбавай трансфармацыі краіны. Пачынаць трэба з азоў, упэўнены беларускі лідар: што ж такое лічбавізацыя, інфарматызацыя, камп'ютарызацыя, чым адрозніваецца адно ад другога, што ў прыярытэце.

«Я ўжо неяк намякаў нашым лічбавікам, увогуле грамадству, што, разважаючы на тэму, далёкую ад разумення нашым насельніцтвам (працэнтаў 90—95 увогуле не разумеюць, што гэта такое), мы проста запужваем, не тлумачачы, што ж гэта за цуд такі — лічбавізацыя, адкуль яна ўзялася», — звярнуў увагу ўдзельнікаў нарады Прэзідэнт.

Адначасова другой тэндэнцыяй сучаснасці ён вызначыў павелічэнне колькасці «прасунутых» людзей, якія бачаць сябе толькі менеджарамі лічбавых кампаній альбо выбіраюць занятак у ІТ-тэхналогіях.

«Але зямлю араць, гайкі тачыць, ствараць прадукты машынабудоўлі — гэта яшчэ застанецца надоўга, калі не назаўсёды. Хоць лічба пранізвае ўсе галіны, і гэтыя ў тым ліку. Ад гэтага мы не адыходзім і адыходзіць не збіраемся», — задаў тон гутарцы Аляксандр Лукашэнка.

Першы намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Турчын у сваім дакладзе падкрэсліў, што сусветная эканоміка пад уплывам інтэлектуальных тэхналогій атрымлівае цалкам іншы выгляд, з'яўляюцца новыя галіны, якія генерую́ць каласальныя даходы фактычна без выкарыстання традыцыйных рэсурсаў.

«Ключавую ролю ў гэтым адыгрывае чалавечы капітал. Беларусь заўсёды славілася сваімі людзьмі, а наша адукацыя цанілася на постсавецкай прасторы. Аднак у новых умовах неабходныя прынцыпова іншыя падыходы, якія дазволяць захаваць і развіваць гэты статус. Наша сістэма адукацыі сёння ў цэлым задавальняе патрэбы ў кадрах, але для паспяховай трансфармацыі і стварэння новай эканомікі нам неабходныя спецыялісты зусім іншай якасці», — растлумачыў першы віцэ-прэм'ер неабходнасць стварэння Hi-Tech-універсітэта.

Падчас нарады беларускі лідар адзначыў, што ў краіне створаны найлепшыя ўмовы для ПВТ, айцішнікаў, але і ІТ-суполка, у сваю чаргу, павінна дапамагаць іншым галінам эканомікі. Карысць ад гэтай дзейнасці павінны адчуваць людзі. Ад айцішнікаў Прэзідэнт патрабуе практыкаарыентаванасці. ІТ-сектар у Беларусі працуе не ў адрыве ад рэальнасці: спецыялісты патрэбныя літаральна ва ўсіх сферах жыцця — ад сельскай гаспадаркі да спорту. Высокія тэхналогіі і рэчаіснасць цесна пераплеценыя — або павінны быць пераплеценыя.

Аляксандр Турчын паведаміў журналістам, што новая ўстанова адукацыі можа пачаць прыём абітурыентаў ужо ў наступным навучальным годзе. Пакуль што вучыцца на спецыялістаў экстра-класа зможа каля 180 студэнтаў. Новая ВНУ мусіць стаць унікальнай установай. Падрыхтоўку студэнтаў у сферы ІТ працягнуць і БДУ з БДУІРам. Яны ж разам з Паркам высокіх тэхналогій і некалькімі буйнымі кампаніямі выступяць заснавальнікамі новай установы.

Стварэнне ўнікальнай ВНУ ў далейшым падштурхне развіццё адукацыі ў Беларусі ўвогуле, бо найлепшыя вынікі амбіцыйнага эксперымента пазней будуць перанесены на сістэму цалкам.

Дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Усевалад Янчэўскі праінфармаваў карэспандэнтаў, што на нарадзе гаворка зайшла і пра школы, каб зацікаўліваць будучых айцішнікаў з маленства.

Па выніках абмеркавання ў Прэзідэнта абавязкі па рэгуляванні сферы лічбавізацыі ўскладзены на Міністэрства сувязі і інфарматызацыі. Такім чынам, яно павінна выйсці на новы ўзровень, што дазволіць пазбегнуць стварэння Міністэрства лічбавізацыі, пра якое апошнім часам шмат казалі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

«Дажынкі-2019»

# САМЫ ВАЖКІ КАРАВАЙ — НА МІНШЧЫНЕ

**Больш за пятнаццаць тысяч чалавек сабраў Мінскі абласны фестываль працаўнікоў сяла «Дажынкі» на «Барысаў-Арэне». На галоўнае свята ўраджаю прыехалі дэлегацыі з 22 раёнаў вобласці і горада Жодзіна, прадстаўнікі гарадоў-пабрацімаў Барысава, хлебаробы са сваімі сем'ямі. Ганаровымі гасцямі сталі дыпламаты дзевяці замежных краін.**



Фота БелТА.

Удзельнікаў жніва цэнтральнага рэгіёна павіншаваў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Віншавальны ліст зачытаў **памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр КОСІНЕЦ.**

— Сардэчна віншую вас з паспяховым завяршэннем асноўнага этапу ўборачнай кампаніі 2019 года. Сёлета ўнёсак Міншчыны ў рэспубліканскі каравай — самы важкі. Вы з'яўляецеся лідарамі і па іншых ключавых паказчыках сельскагаспадарчай вытворчасці, — адзначаецца ў лісце.

Нагадаем, намалот збожжавых і зернебабовых на Міншчыне сёлета склаў 1,7 мільёна тон. Кожная чацвёртая тона збожжа вырашчана на палях вобласці. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых — 34 цэнтнеры з гектара, што на шэсць цэнтнераў вышэй за леташнюю. У асобных раёнах гэты паказчык дасягнуў 50 цэнтнераў з гектара і больш.

І, вядома, галоўнай падзеяй свята стала ўшанаванне перадавікоў жніва. Пераможцам абласнога спаборніцтва за дасягненне высокіх вынікаў на хлебнай ніве стаў Нясвіжскі раён. На другім месцы — Маладзечанскі, на трэцім — Смалявіцкі. Сярод гаспадарак не было роўных адкрытаму акцыянернаму таварыству «Хахлова». Найлепшым старшым камбайнерам прызнаны Аляксандр Анціпцаў з саўгаса «Рачкавічы». Па традыцыі ўзнагароды ўручылі не толькі камбайнерам, кіроўцам, аператарам КЗС, але і спецыялістам, якія прыклалі шмат намаганняў, каб вырасціць ураджай. Прыемна і тое, што не забыліся пра жонак хлебаробаў, якія вялі хатнія справы, стваралі ўтульнасць для спадарожнікаў па жыцці, пакуль тыя шчыравалі ў полі. Яркім, відовішчным атрымалася шэсце дэлегацый раёнаў і горада Жодзіна. Яны прайшліся па «Барысаў-Арэне» ў нацыянальных строях, з палотнішчамі, аздобленымі гербамі сваіх гарадоў. Завяршылася шэсце вынасам палотнішча з гербам Мінскай вобласці. Гэтую пачэсную місію даручылі маладым людзям, з якімі старэйшае пакаленне звязвае будучыню і росквіт Беларусі.

Пасля гэтага ўдзельнікаў жніва, гасцей свята павіншаваў **старшыня Мінаблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** Анатоль Міхайлавіч падкрэсліў, што фестывалі-кірмашы працаўнікоў сяла — адна з самых яркіх традыцый нашага краю. Хлеб — усяму галава, таму свята ўраджаю ў нас адзначаюць усім народам. Губернатар таксама падкрэсліў, што Барысаў значна пахарашэў. Не ўсё давалася лёгка, тым не менш вынік ёсць. Разам з тым, як канстатаваў **старшыня Барысаўскага райвыканкама Генадзь ДЗЕНГАЛЁЎ,** добраўпарадкаванне, уладкаванне аб'ектаў працягнецца і пасля «Дажынак».

Шмат цікаўных сабраў і конкурс караваяў, у якім удзельнічалі ўсе раёны Міншчыны. Сапраўды, цяжка было выбраць найлепшы з іх — майстры пастараліся на славу, паказалі свае ўменне і фантазію. А галасавалі ўдзельнікі свята за гэтыя шэдэўры... сушкамі. Найбольшую колькасць «ачкоў» набраў Клецкі раён. **Старшыня райвыканкама Анатоль ЛАДЫГА** атрымаў сертыфікат на калектыўную экскурсію ў Брэст.

Больш за дзве тысячы гледачоў наведала канцэрт з удзелам самадзейных калектываў і зорак беларускай эстрады. Гучнымі апладысментамі гледачы віталі Анатоля Ярмоленку, Анжаліку Агурбаш, ансамбль «Сябры», Аляксандра Саладуху.

А тыя, каму не хапіла месцаў на трыбунах, маглі знайсці занятак па душы. Удзельнічалі ў гульнях, конкурсах, розных забавах. Аматары смачна паесці абыходзілі імправізаваныя сельскія падворкі, якія зладзілі ўсе раёны. Гаспадары запрашалі пачаставацца хатнімі нарыхтоўкамі, нацыянальнымі стравамі, у тым ліку і тымі, якія здаўна гатуюць толькі ў іх мясцовасці.

Прадпрыемствы вобласці прапанавалі сваю прадукцыю: як харчовую, так і шырокага спажывання.

Нагадаем, што налета «Дажынкі» будзе прымаць Чэрвень.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ДРЭВЫ ПАМЯЦІ

## 75 елак высаджаны на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» у рамках кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму!»

**У мерапрыемстве ўзялі ўдзел супрацоўнікі Цэнтральнага апарату Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя разам з прадстаўнікамі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Адміністрацыяй Заводскага раёна Мінска.**

75 маладых елак, высаджаных падчас акцыі, дапоўнілі своеасаблівую хваёвую алею, што размяшчаецца на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу на перакрыжаванні вуліц Сяліцкага і Шабаны.

— Акцыі ў рамках глабальнай кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму!» праходзяць для таго, каб уцягнуць як мага больш насельніцтва ў работу па навядзенні парадку — упарадкаванне двара, вуліцы, мікрараёна, раёна і ў цэлым нашай краіны, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.** — Зялёныя гарады — гэта перш за ўсё чыстае атмасфернае паветра. Таму мы імкнёмся зрабіць так, каб пры высокай урбанізацыі людзі маглі дакранууца да прыроды.



Далучыліся да акцыі на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

— На гэтым месцы мы штогод высаджваем дрэвы, займаемся ўборкай прылеглай тэрыторыі, як мінімум два-тры разы вясной і восенню бяром удзел у такіх мерапрыемствах, — расказаў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Аўтазаводскай выбарчай акрузе Валерый КУРСЕВІЧ.**

* * *

З 12 кастрычніка да 2 лістапада 2019 года ў глабальнай экалагічнай кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму!» больш за 3000 работнікаў сістэмы Мінпрыроды зробяць свой унёсак у азеляненне краіны і высадзяць каля 30 000 маладых дрэў (дубы, ліпы, бярозы, туі, елкі) і больш за 1300 кустоў. Акцыі будуць праходзіць кожную суботу да 2 лістапада (уключна) у буйных населеных пунктах усіх абласцей краіны. Далучыцца да добрых спраў можа кожны. Для гэтага трэба падаць заяўку на ўдзел у акцыі на адрас электроннай пошты, пазначанай на сайтах абласных камітэтаў прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

**Вераніка КОЛАСАВА, фота аўтара.**

## Добрая магчымасць задаць пытанне

**16 кастрычніка, у сераду, прамую тэлефонную лінію правядзе ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Паўлавіч ГУЛЯКА. Задаць пытанні яму можна будзе з 10.00 да 12.00 па тэлефоне 8 017 284 89 65.**